# Архітэктура Беларусі



**Мірскі замак**

Быў узведзены ў XVI ст. Юрыем Ільінічам, магнатам і дзяржаўным дзеячам Княства Літоўскага. Замак змяніў шмат уладальнікаў: сярод іх былі Радзівілы, Вітгенштэйны, Святаполк-Мірскія.

**Прачытайцеі растлумачце радкі верша Петруся Броўкі:**

Ідзе архітэктар,
Задумай багаты,
Ён бачыць свой горад
Прыгожы, крылаты!



**Полацкі Сафійскі сабор** – помнік сакральнага дойлідства XI–XVIII ст. у г. Полацк.



**Слонімская сінагога**

Помнік архітэктуры барока, узведзены ў 1642–1648 гадах, уваходзіў у сістэму абарончых збудаванняў Слоніма, цяпер знаходзіцца ў гістарычным цэнтры горада.



**Касаўскі палац** (таксама вядомы як палац Пуслоўскіх) – неагатычны палац у выглядзе абарончага замка. Маёнтак знаходзіцца недалёка ад урочышча Мерачоўшчына, дзе нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, нацыянальны герой Польшчы, Беларусі і ЗША.



**Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс** – помнік архітэктуры XVI–XVIII стагоддзяў. Закладзены князем М.К.Радзівілам Сіроткам у 1583 г. на паўднёвым захадзе ад Нясвіжа.



**Палац Румянцавых-Паскевічаў** – помнік архітэктуры XVIII–XIX стагоддзяў, галоўная славутасць горада Гомеля, кампазіцыйны цэнтр Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, які ўключае, акрамя палаца, гарадскі парк, Петрапаўлаўскі сабор, капліцу-пахавальню.

**Адкажыце на пытанні:**

1 Якія будынкі ўнесены ў Сусветную спадчыну ЮНЕСКА?
2 Які будынак быў створаны па ініцыятыве Пятра Машэрава?
3 Як называецца іудзейскі малітоўны дом?
4 Падбярыце сінонім да слова “дойлід”.

*Адказы: 1. Мірскі і Нясвіжскі замкі. 2. Палац Рэспублікі. 3. Сінагога. 4. Архітэктар.*



**Палац Рэспублікі** – беларускі культурны і дзелавы цэнтр, які знаходзіцца на Кастрычніцкай плошчы Мінска.

# Гераічнае мінулае Беларусі

**Складзіце выказванне**
*бацька багаты у быў вайны той каго застаўся пасля жывы самы*
Р. Барадулін

## Адкажыце на пытанні:

Які дзень тыдня быў 9 мая 1945 года?

*Адказ: серада.*

| | |
|---|---|
| Як звалі юнага разведчыка (на фота) з вёскі Станькава, які ў 1944 годзе трапіў у акружэнне фашыстаў і падарваў сябе гранатай, каб не трапіць у палон?  | Імя якога беларускага пісьменніка ёсць сярод памерлых у брацкай магіле на Кіраваградчыне? |
| Якое прозвішча ў арганізатара партызанскага атрада на Віцебшчыне Бацькі Міная (на фота)?  | У якім горадзе Беларусі знаходзіцца помнік маці і яе пяці сынам, якія загінулі на вайне?  |

*Адказы: Марат Казей. Васіль Быкаў. Шмыроў. г. Жодзіна.*

**Віктарына: “Вялікая Айчынная вайна”:**
1 Самы знакаміты савецкі танк Вялікай Айчыннай вайны.
2 Хто ўзначаліў адзін з першых партызанскіх атрадаў, сфарміраваны на пяты дзень вайны ў Пінскім раёне?
3 Колькі ў Беларусі гарадоў-герояў?
4 Як звалі нашага земляка, які выратаваў пры штурме Берліна нямецкую дзяўчынку, а сам быў смяротна паранены?
5. Кодавая назва беларускай наступальнай аперацыі.

*Адказы: 1. Т-34. 2. Васілій Корж. 3. Адзін. 4. Трыфан Андрэевіч Лук’яновіч. 5. “Баграціён”.*



**Брэсцкая крэпасць** – комплекс абарончых збудаванняў XIX – пачатку XX стагоддзяў у Брэсце (Брэст-Літоўск). Пабудавана як частка сістэмы ўмацаванняў на захадзе Расійскай імперыі. Размешчана на 4 астравах утвораных рэкамі Заходні Буг і Мухавец, іх рукавамі і сістэмай каналаў З вясны 1941 у крэпасці дыслацыраваліся часці 6-й Арлоўскай і 42-й стралковай дывізій 28-га стралковага корпуса, якія 22 чэрвеня 1941 прынялі ўдар нямецкай арміі і каля тыдня трымалі арганізаваную абарону. 28 ліпеня 1944 у ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі Брэст разам з крэпасцю вызвалены ад нямецкіх войск.

Якую падзею гісторыі беларусы згадваюць у Дзень памяці і смутку 22 чэрвеня?
*Адказ: Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.*

# Беларуская мова і літаратура

**Варта задумацца**
Родная мова – багаты скарб, які прыйшоў з глыбіні стагоддзяў.







**Ефрасіння Полацкая**, свецкае імя Прадслава – дачка князя Усяслава, ігумення. асветніца, першая мецэнатка, па заказе якой быў створаны храм Спаса, шасціканцовы Крыж, пабудаваны манастыры, жанчына, кананізаваная Рускай праваслаўнай царквой, пасля прылічаная да святых.

**Францыск Скарына** – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, асветнік-гуманіст, пісьменнік, грамадскі дзеяч, прадпрымальнік, вучоны-медык. Перакладчык і выдавец кніг Біблії беларускім ізводам царкоўнаславянскай мовы.



Беларуская энцыклапедыя, поўная назва – Універсальная Беларуская энцыклапедыя (БелЭн) – агульная энцыклапедыя, універсальны сістэматызаваны беларускі даведнік, які змяшчае самыя разнастайныя звесткі па ўсіх галінах ведаў. Беларуская Энцыклапедыя – першая нацыянальная энцыклапедыя Незалежнай Беларусі. Галоўным рэдактарам быў Барыс Сачанка, потым – Генадзь Пашкоў.

**Гонар беларускай гісторыі**
Закончыце выразы:
Статут 1588 года – гэта першая беларуская …
"Псалтыр" 1517 года – першая …
*Адказы: Канстытуцыя. Кніга.*

**Скарб і гонар беларусаў**
Назавіце адным словам_________



**"Буквар" учора**

**і сёння**








Першая кніга, якая мела назву "Буквар", з'явілася на свет больш за 400 гадоў таму. Яна была выдадзена 24 ліпеня 1618 года ў друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага брацтва ў Еўі (цяпер тэрыторыя Літоўскай Рэспублікі).

**Растлумачце выказванне:**
"Дзяржаўным народам прызнаецца народ, які мае свае герб, гімн, сцяг, буквар і энцыклапедыю", – сцвярджаў класік беларускай літаратуры Максім Танк.

# Традыцыі і культура Беларусі

## Адкажыце на пытанні:

| | |
|---|---|
| Мог выконваць ролю стала, стула, ложка і непасрэдна ёмістасці для адзення, прадметаў хатняга побыту, каштоўнасцей.<br>“Шчасце ў … не пакладзеш”, – кажа прыказка, якую трэба дапоўніць гэтым прадметам. | Дошка бясплатных прыватных аб’яў Беларусі ў інтэрнэце. |
| Устаўце назву прадмета з малюнка ў прыказку і даведайцеся, які прадмет мэблі быў папярэднікам скрыні: “Адна сарочка на мне, а другая ў … на дне”.  | Хто на вяселлі павінен быў выкупіць у дружыны маладой гэты прадмет мэблі? Што знаходзілася ў ім? Скрыня сакоча. Чаго яга хоча? Паўтара залатога ад князя ...  |

*Адказы: Куфар.Kufar.by. Кубел. Малады (жаніх), пасаг маладой.*

Суаднесці фразеалагізмы з тымі рысамі беларусаў, якія яны раскрываюць:

Сустракаць хлебам-…  працавітасць
Разам хлеб-… есці  гасціннасць
Мець свой кавалак …  шчодрасць
Царскі …  узаемадапамога

Адказы: соллю (гасціннасць), соль (узаемадапамога), хлеба (працавітасць), стол (шчодрасць).

Віса вісіць, хода ходзіць, хто ні пройдзе, той і доіць. Што гэта?

*Адказ: калодзежны журавель.*



### Складзіце назвы посуду:

ш р а ч к г о

ы л ш а д г

я н ь э а л т п

а п о д к с

*Адказы: гаршчок, гладыш, патэльня, сподак.*



Як адным словам у беларусаў называецца “чырвоны кут”, дзе вісяць абразы?

**Топ-7 “Гонар Радзімы”**

1 Птушка, якая вяртаецца з выраю на малую радзіму на Дабравешчанне.
2 Нацыянальная страва беларусаў з бульбы.
3 Вельмі працалюбівае насякомае, якое, калі каго-небудзь кусае, памірае.
4 Чароўны сімвал язычніцкага свята Купалле.
5.Адгадайце загадку: сядзяць паненачкі ў чырвоных сукенaчках, хто ідзе, дык паклоніцца.
6 “У суботу Янка ехаў ля ракі, пад вярбой Алёна мыла…”. Закончыце народную песню і даведаецеся пра яшчэ адзін прадмет нашага гонару.
7 Высокі старадаўні магільны насып.

*Адказы: 1. Бусел. 2. Дранікі. 3. Пчала. 4. Папараць. 5. Суніцы. 6. Ручнік. 7. Курган.*

# Знакамітыя людзі Беларусі



**Соф'я Кавалеўская**

Першая ў свеце жанчына-прафесар матэматыкі паходзіць са шляхецкага беларускага роду. Дзяцінства правяла ў маёнтку Палібіна Віцебскай губерні, а ў 18 гадоў заключыла фіктыўны шлюб, каб паехаць за мяжу і займацца навукай. Працы Кавалеўскай прысвечаны матэматычнаму аналізу, механіцы, астраноміі.



**Павел Сухі**

Авіяканструктар, вынаходнік, адзін са стваральнікаў рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі, аўтар паўсотні арыгінальных канструкцый самалётаў, больш за трыццаць з якіх былі пабудаваны і выпрабаваны. Нарадзіўся ў 1895 г. у горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці.



**Міхаіл Высоцкі**

Выдатны вучоны і канструктар, пад кіраўніцтвам якога ствараліся лепшыя аўтамабілі МАЗ, на працягу дзесяцігоддзяў генеральны канструктар па аўтамабільнай тэхніцы Беларусі. Аўтар 134 вынаходстваў і 17 патэнтаў. Герой Беларусі (2006). Нарадзіўся ў в. Семежава Мінскай вобласці (1928).



**Жарэс Алфёраў**

Нарадзіўся ў Віцебску ў 1930 годзе. Алфёраў удастоены Нобелеўскай прэміі па фізіцы ў 2000 годзе.



**Мітрапаліт Філарэт**

Ганаровы Патрыяршы экзарх усяе Беларусі, Герой Беларусі за за шматгадовы асабісты ўклад у духоўнае адраджэнне беларускага народа, умацаванне дружбы і брацкіх сувязей паміж народамі, развіццё міжканфесійнага дыялога.

**Адкажыце на пытанні віктарыны: "Мае знакамітыя землякі:**

1 Дзяржаўны і ваенны дзеяч, гетман Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, дыпламат, мысліцель. Адзін з галоўных стваральнікаў Статута ВКЛ (1588 г.) – выдатнага помніка прававой і палітычнай думкі, па сутнасці першай канстытуцыі ў Еўропе *(Леў Сапега)*.

2 Выдатны мастак, які распрацаваў уласны тып нацюрморта ў спалучэнні з партрэтам *(Іван Хруцкі)*.

3 Яркі выканаўца, кампазітар і аранжыроўшчык, збіральнік беларускага фальклору, стваральнік легендарнага ансамбля "Песняры" *(Уладзімір Мулявін)*.

4 Першы беларускі касманаўт, вучоны ў галіне тэхнічных навук, двойчы Герой Савецкага Саюза *(Пётр Клімук)*.

# Прырода Беларусі

**Прачытайце і растлумачце радкі верша Эдзі Агняцвет:**

Зямля з блакітнымі вачамі –
Раздолле рэчак і лугоў!




**Белавежская пушча** – адзін з самых старых запаведных лясных масіваў Еўропы, знаходзіцца на мяжы Беларусі (Брэсцкая вобласць, Гродзенская вобласць) і Польшчы ў экарэгіёне Сармацкіх мяшаных лясоў. Агульная плошча каля 145 тыс. га.

Пушча з’яўлялася апошнім прыродным месцам пражывання самага буйнога прадстаўніка еўрапейскай фаўны – зубра. Для аховы ўнікальных прыродных комплексаў створаны нацыянальны парк Белавежская пушча (Беларусь) і Белавежскі нацыянальны парк (Польшча). Белавежская пушча занесена ў Сусветную спадчыну ЮНЕСКА.




**Бярэзінскі біясферны запаведнік** – беларускі дзяржаўны запаведнік, створаны ў 1925 годзе. Вялікі комплекс хваёвых лясоў, якія перамяжаюцца з верхавымі і нізіннымі балотамі і поймамі рэк. Прыродныя ўмовы запаведніка характарызуюцца некранутым абліччам лясоў і вялікіх сфагнавых балот. Тут захаваліся ўнікальныя ў Еўропе балотныя масівы, агульная плошча якіх складае 50700 гектараў.

Вельмі багаты жывёльны свет Беларусі. Усяго налічваецца каля 27,1 тыс. відаў разнастайных жывёл Сюды ўключаны беспазваночныя, птушкі, млекакормячыя, рыбы, земнаводныя і паўзуны. Найбольш вядомыя прадстаўнікі жывёльнага свету Беларусі – гэта лось, дзік, казуля, заяц (русак і бяляк), вавёрка, лісіца, алень, бабёр, куніца і шмат іншых.

Рэспубліка Беларусь мае раўнінную паверхню. Агульная плошча зямель – 20,8 млн га. Беларуская зямля вельмі багатая. У яе нетрах выяўлена больш за 4 тыс. радовішчаў карысных выкапняў. Наша краіна поўнасцю забяспечвае свае патрэбнасці ў калійных і кухонных солях, керамічных глінах, будаўнічых пясках, будаўнічым камені, прэсных і мінеральных водах.

**Хвіліна кемлівасці**
**“Цікавыя мясціны Беларусі”**

1 Лясны масіў, дзе можна сустрэць 600-гадовыя дубы?
2 “Край неПалоханых звяроў і птушак”.
3 Месца, якое ў народзе называюць “залатое дно”

*Адказы: 1. Белавежская пушча. 2. Бярэзінскі запаведнік. 3. Тарфянік.*

# Гарады Беларусі





**Сказана з гонарам!**

Беларусь – гэта 7 "Я", "наша сям'я", якая складаецца з 6 абласных цэнтраў і сталіцы ў Мінску!

Гомель – другі па колькасці насельніцтва горад у краіне. Размешчаны на паўднёвым усходзе рэспублікі на рацэ Сож за 302 км на паўднёвы ўсход ад Мінска.

Віцебск – горад на рацэ Заходняя Дзвіна. Назва горада пайшла ад назвы ракі Віцьбы.





Гродна – горад у заходняй частцы краіны, на рацэ Нёмане, на мяжы з Польшчай і Літвой (за 15 і 30 км адпаведна). Адзін з найстарэйшых гарадоў Беларусі. Упершыню згаданы пад 1128 годам у Іпацьеўскім летапісе.

Брэст – горад на рацэ Заходні Буг пры ўпадзенні ў яго Мухаўца. З'яўляецца адным з найважнейшых транспартных вузлоў Беларусі.





Магілёў – горад ва ўсходняй частцы Беларусі, Порт на рацэ Дняпро. Знаходзіцца за 201 км ад Мінска. Трэці паводле колькасці насельніцтва горад краіны. Насельніцтва 381 353 чал.

Мінск – сталіца і найбуйнейшы горад Беларусі, на рацэ Свіслачы. Займае плошчу ў 348,85 $км^2$. Месціцца за 70 км на паўночны захад ад геаграфічнага цэнтру Беларусі. Гістарычны цэнтр утвараюць Верхні горад, Ракаўскае і Траецкае прадмесці. Упершыню згадваецца ў "Аповесці мінулых часоў" пад 1067 годам.



**Адзначце на карце Беларусі, дзе вы жывяце**

**Адкажыце на пытанні:**

1 Горад, у якім праводзіцца фестываль нацыянальных культур.

2 Горад, у якім праводзіцца фестываль мастацтваў "Славянскі базар".

*Адказы: 1. Гродна. 2. Віцебск.*

# Прамысловасць Беларусі

## Машынабудаванне



У Беларусі выпрабляецца шырокі спектр машынабудаўнічай прадукцыі.
Гэта грузавыя аўтамабілі (МАЗ, БелАЗ);
аўтобусы (МАЗ, “Нёман”);
тралейбусы (“Белкамунмаш”);
трактары (Мінскі трактарны завод, Магілёўскі аўтамабільны завод);
сельскагаспадпадарчая тэхніка (“Гомсельмаш”);
тэлевізары (“Гарызонт”, “Віцязь”), халадзільнікі (АТЛАНТ); металарэжучыя станкі і многае іншае.
У Беларусі размешчаны Беларускі аўтамабільны завод (марка "БелАЗ) – адзіны ў краінах СНД і адзін з найбуйнейшых у свеце вытворцаў кар’ернай тэхнікі.





**Хімічная прамысловасць** выпускае:
Шкловалакно і вырабы на яго аснове;
Мінеральныя ўгнаенні (калійныя, азотныя і фосфарныя);
Поліэфірыныя валокны і ніткі;
Поліэтылен высокага ціску;
Поліамідныя валокны і ніткі, кордныя тканіны.



**Металургічная галіна** Беларусі ўяўляе сабой холдынг “Беларуская металургічная кампанія”, які ўключае ў сябе: ААТ “Беларускі металургічны завод”, “Магілёўскі металургічны завод” і інш. прадпрыемствы.
У розных гарадах Беларусі працуюць:
Рэчыцкі метызны завод, які выпускае цвікі і дрот,
Маладзечанскі завод лёгкіх металаканструкцый,
які выпускае сталёвыя трубы.
Яшчэ адным буйным прадпрыемствам з’яўляецца завод “Цэнтраліт” у Гомелі, які спецыялізуецца на ліцці вырабаў з высокатрывалага чыгуну (адліўкі, каналізацыйныя люкі і інш.).

**Пытанні:**

1 Якія яшчэ галіны прамысловасці развіваюцца ў Беларусі?
2 Які беларускі транспартны сродак прадстаўлены на грошах В’етнама?
3 Беларускі горад шахцёраў.
4 Самы распаўсюджаны карысны выкапень у нашай краіне.

*Адказы: 1. Хімічная, лёгкая, фармацэўтычная, харчовая і інш.*
*2. Трактар “Беларусь”. 3. Салігорск.*
*4. Торф.*

# Дзяржаўныя святы Беларусі

**Дзень Канстытуцыі – 15 сакавіка**
Канстытуцыя Беларусі была прынята 15 сакавіка 1994 года. Яна ўпершыню ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці замацавала статус рэспублікі як унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы.




**Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі** – 2 красавіка
Штогод адзначаецца 2 красавіка. Менавіта ў гэты дзень у 1996 годзе прэзідэнты дзвюх дзяржаў падпісалі дагавор “Аб стварэнні Супольнасці Расіі і Беларусі”.

**Дзень Перамогі – 9 мая** – свята перамогі СССР над нацысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў.

**Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна**
адзначаецца штогод у другую нядзелю мая ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 157 ад 26 сакавіка 1998 года.
У малюнку **Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь** адлюстроўваюцца асноўныя нацыянальныя і духоўныя каштоўнасці беларусаў: грамадзянская еднасць, працавітасць, міралюбнасць.
**Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь** уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальных каляровых палос: верхняй чырвонага колеру і ніжняй зялёнага колеру. Злева вертыкальна размешчаны беларускі арнамент чырвонага колеру на белым фоне.
**Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь** – гэты ўрачысты музычна-паэтычны твор, які выконваецца ў выпадках, прадугледжаных законам: падчас афіцыйных дзяржаўных цырымоній, свят, спаборніцтваў.

**Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь** –
3 ліпеня
Гэта дзень вызвалення ў 1944 годзе горада Мінска ад нацысцкіх захопнікаў.

**Дзень народнага адзінства** – 17 верасня
Дзяржаўнае свята Рэспублікі Беларусь, якое ўведзена 7 чэрвеня 2021 года ў гонар уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР, якое пачалося 17 верасня 1939 года з паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

**Пытанні:**
1 Якое свята ў краіне не адзначалі яшчэ 20 год пасля яго падзей?
2 У якім горадзе знаходзіцца плошча Дзяржаўнага сцяга?
3 Якое свята пачалі адзначаць пасля рэферэндуму 1996 года?
*Адказы: 1. Дзень Перамогі. 2. Мінск. 3. Дзень Незалежнасці.*